НА РЫШТАВАННЯХ ЖЫЦЦЯ

Пасляслоўе вучоных да трэцяга працоўнага семестра

Студэнцкія будаўнічыя атрады нашага інстытута прайшлі складаны шлях ад першых маладзёжных груп ініцыятараў руху юнакоў і дзяўчат. За гэтыя дзесяць год змяніліся новыя формы ўнутранай арганізацыі атрада, вызначыліся своеасаблівыя рытуалы і традыцыі, значна павысілася эканамічная эфектыўнасць вытворчай дзейнасці байцоў. Аднак у трэцім семестры хлопцы і дзяўчаты не толькі будуюць. У студэнцкіх атрадах фарміруюцца лепшыя рысы калектывізму і таварыскасці, ідэйная перакананасць, беражлівыя адносіны да сацыялістычнай уласнасці, выхоўваецца дзяржаўны, творчы падыход да справы. Значэнне студэнцкага руху заключаецца і ў тым, што ён рыхтуе працаўніка новага тыпу, усебакова развітага, здольнага як да фізічнай, так і да разумовай працы і адносіцца да ле не як да прымусовай неабходнасці, а як да першай жыццёвай патрэбнасці. Апроч таго, гэты рух устанавіўся і як важная форма інтэрнацыянальнага выхавання моладзі. Студэнтаў нашага інстытута летам можна сустрэць на будоўлях Заходняй Сібіры, Казахстана і Крайняй Поўначы. Працуючы ў самых аддаленых кутках краіны, яны знаёмяцца з іх гераічнай мінулым, выразней бачаць дасягненні асобных саюзных рэспублік, яшчэ глыбей разумеюць, што гэтыя поспехі — вынік увасаблення ў жыццё прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі. Членаў будаўнічых атрадаў розных нацыянальнасцей радняць не толькі адзіныя мэты і інтарэсы, але і агульнанародныя справы і клопаты.

Мэта, у імя якой студэнцкая моладзь імкнецца на будоўлі, выказана ў большасці заяў: «хачу прынесці карысць грамадству там, дзе гэта больш за ўсё патрэбна», «жадаю быць на пярэднім краі», «трэба праверыць сябе ў цяжкіх умовах». І гэта не проста словы. Выбарачнае сацыялагічнае даследаванне, праведзенае кафедрай гісторыі КПСС, палітэканоміі і навуковага камунізму інстытута, паказала, што мэты ажыццяўляюцца. Вось некаторыя запісы з анкет: «я атрымаў добрую загартоўку ў арганізатарскай, вытворчай і грамадска-палітычнай рабоце», «атрымала выключна вялікае задавальненне, бо нарэшце адчула, што зрабіла нешта карыснае»; «калі ў ВНУ можна было ішоў раз спазніцца на лекцыю, атрымліваючы за гэта толькі «наганяй» ад выкладчыка і адміністрацыі, то ў атрадзе спазненне на работу, невыкананне дзённага задання і г. д. вядзе да сур'ёзнай адказнасці перад усімі таварышамі». Падобных запісаў многа. Яны дазваляюць зрабіць вывад, што пры ўмелай арганізацыі, ясным вызначэнні мэты працоўныя семестры дапамагаюць абучыць студэнтаў метадам кіраўніцтва калектывам, даць навыкі грамадска-палітычнай работы.

Трэцяе лета запар выязджае камандзірам студэнт чацвёртага курса Пётр Шыхалай, і кожны раз атрад займае адно з першых месц у сацыялістычным спаборніцтве атрадаў вобласці. Стыль работы камуніста Шыхалая характарызуецца перш за ўсё ўменнем аб'ядноўваць і актывізаваць усе здольнасці і сілы калектыву для рашэння вытворчых задач.

Трэці семестр дабратворна ўплывае на асабістыя планы хлопцаў і дзяўчат. Практыка размеркавання выпускнікоў паказвае, што былыя байцы імкнуцца перш за ўсё туды, дзе можна прынесці найбольшую карысць Радзіме. Іх не палохаюць ні маразы Сібіры і Крайняй Поўначы, ні часовая неўладкаванасць быту, ні аддаленасць ад дому. Многія выпускнікі інстытута — удзельнікі студэнцкіх будоўляў — дабіліся вялікіх працоўных поспехаў. Імі і сёння ганарымся мы.

Яшчэ ў 1963 годзе адправіўся на цалінныя будоўлі Казахстана студэнт другога курса лячэбнага факультэта Рыгор Бурак. На наступны год ён едзе ўжо не байцом, а камандзірам. Камандзірам ён быў на студэнцкіх будоўлях і ва ўсе наступныя гады. Загартоўка не прайшла бясследна. Цяпер Рыгор Бурак працуе асістэнтам кафедры нармальнай анатоміі. Ён увесь час ідзе наперад, працягвае будаваць новае, але ўжо ў медыцынскай навуцы. Успамінаючы мінулае, малады вучоны лічыць, што будоўля дала яму вельмі многае, навучыла сур'ёзнай рабоце, паслядоўнасці і ўседлівасці.

Колькасць заяў з просьбай прыняць у будаўнічы атрад расце з году ў год. Яны разглядаюцца на камсамольскіх сходах груп, на якіх рашаецца, ці заслужыў студэнт быць байцом. Толькі лепшыя з лепшых маюць бесперашкодныя магчымасці стаць удзельнікам працоўнага семестра.

Зразумела, у атрады было б мэтазгодна ўключаць і студэнтаў, якія адстаюць па некаторых дысцыплінах. Практыка паказвае, што імена яны больш, чым іншыя, маюць патрэбу ў выхаванні волі, маральных якасцей. Але даводзіцца лічыцца з тым, што фарміраванне будаўнічых атрадаў звязана з пэўнымі цяжкасцямі. Студэнты іншы раз вымушаны датэрмінова здаваць веснавую экзаменацыйную сесію, а восенню прыступаць да заняткаў без дастатковага адпачынку. А гэта далёка не пад сілу кожнаму. Апроч таго, культурай паводзін, адносінамі да працы студэнты аказваюць вялікі ўплыў на мясцовае насельніцтва. У нашых камсамольцаў ён асабліва непасрэдны, паколькі яны выконваюць функцыі і медыцынскіх работнікаў. Вось таму адна з найпершых задач рэктарата, партыйнай і камсамольскай арганізацый у тым, каб падбіраць кандыдатаў у будаўнічыя атрады не толькі па іх паспяховасці, але і з улікам такіх рыс характару, як тактоўнасць і чуласць.

Жыццё і праца ў такім калектыве, як студэнцкі будаўнічы атрад, павінны ўплываць на працягу паравнаўча невялікага часу, выключаюцца незвычайнасцю і навізной. У гэтых умовах складваюцца ўзаемаадносіны са сваімі бліжэйшымі сябрамі. Выбарачнае абследаванне паказала, у прыватнасці, што каля 70 працэнтаў хлопцаў і дзяўчат выбіраюць сабе сяброў з ліку тых, з кім яны разам былі на будоўлях. І не выпадкова студэнцкія будаўнічыя калектывы і пасля заканчэння працоўнага семестра.

Удзел камсамольцаў у працоўных семестры аказвае самы дабратворны ўплыў на іх адносіны да вучобы. Сярэдні бал паспяховасці студэнтаў, якія летам 1971 года працавалі на будоўлях, склаў у зімовую экзаменацыйную сесію 1971—1972 навучальнага года 4,6. Работа на «цаліне» ўплывае таксама і на грамадска-палітычную актыўнасць студэнтаў. Большасць байцоў лічыць, што «цаліна» з'яўляецца незаменным месцам для стажыроўкі маладых лектараў і ўдзельнікаў агітбрыгад.

Варта адзначыць, што асобныя кіраўнікі будоўляў недаверліва адносяцца да студэнцкага руху. У гэтым прычына таго, што томскі, пскоўскі і некаторыя іншыя атрады ў 1972 годзе нясподзявана асвоілі капітальныя ўкладанні. Байцы падмануліся ў сваіх чаканнях, атрымалі глыбокую псіхалагічную траўму, яны не знайшлі ў жыцці атрадаў таго, што іх прыцягвала раней, да паездкі.

Немалаважнае і такое пытанне. Работа большасці студэнтаў на будоўлях не звязана з іх будучай прафесіянальнай дзейнасцю. Для многіх спецыяльнасцей спалучэнне проста немагчыма. А вось для хлопцаў і дзяўчат нашага інстытута не толькі магчыма, але і неабходна. Думаецца, што камсамольцы маглі б дакладна арганізаваць медыцынскую службу на буйнейшых будоўлях, стварыць студэнцкія пункты аховы здароўя, паліклінікі, санітарна-асветныя брыгады.

Нядаўна група студэнтаў медінстытута выступіла з ініцыятывай, якая яшчэ раз пераконвае, што працоўны семестр з'яўляецца адным з галоўных сродкаў выхавання моладзі. «Асэнсаваўшы задачы, пастаўленыя XXIV з'ездам КПСС перад сельскай гаспадаркай, — заяўляюць студэнты, — мы жадаем у працэсе вучобы ў інстытуце набыць другую спецыяльнасць — механізатара і лічым мэтазгодным падрыхтаваць атрад механізатараў з ліку студэнтаў інстытута для работы ў калгасах і саўгасах вобласці ў ліпені—верасні, калі фронт сельскагаспадарчых работ найбольш шырокі і патрэбнасць у сельскагаспадарчых кадрах асабліва вялікая». Думаецца, што гэта ініцыятыва заслугоўвае ўвагі.

Я. МЯДЗВЕДСКІ,
рэктар Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, дацэнт.
А. КАПАЦІЛАЎ,
старшы выкладчык.